МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

29.10.2013 № 170

г. Мінск

г. Минск

Аб правядзенні II Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў ”Зорка ўзышла над Беларуссю“

На падставе падпункта 5.10 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, зацвержанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 2001 г. № 1558 “Вопросы Министерства культуры Республики Беларусь”

ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці ў лістападзе 2013 года – красавіку 2014 года II Рэспубліканскі конкурс маладых талентаў ”Зорка ўзышла над Беларуссю“ (далей – конкурс).

2. Зацвердзіць:

прыкладзенае Палажэнне аб II Рэспубліканскім конкурсе маладых талентаў ”Зорка ўзышла над Беларуссю“;

склад арганізацыйнага камітэта заключнага этапа II Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў ”Зорка ўзышла над Беларуссю“ згодна дадатку.

3. Начальнікам галоўных упраўленняў (упраўленняў) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама забяспечыць правядзенне адборачных этапаў конкурсу ў тэрміны, вызначаныя ў Палажэнні, і накіраванне пераможцаў для ўдзелу ў заключным этапе конкурсу.

4. Дзяржаўнай установе адукацыі ”Інстытут культуры Беларусі“ (Рэмішэўскі К.І.):

4.1. да 22 снежня 2013 г. накіраваць у Міністэрства культуры праект каштарыса выдаткаў на правядзенне конкурсу;

4.2. ажыццявіць арганізацыю і правядзенне конкурсу;

4.3. прадставіць у Міністэрства культуры да 25 кастрычніка 2013г. прапановы па складу журы намінацый конкурсу.

5. Аддзелу ўстаноў адукацыі і работы з творчай моладдзю (Гуляева А.Р.) да 25 лістапада 2013 г. унесці прапановы аб месцах правядзення

конкурсных выступленняў па намінацыях для зацвярджэння арганізацыйным камітэтам конкурсу.

6. Кантроль за выкананнем загаду ўскласці на намесніка Міністра культуры Чэрніка В.М.

Міністр Б.У.Святлоў

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Аддзел кантролю і справаводства
Для дакументаў

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
29. 10. 2013 № 170

ПАЛАЖЭННЕ
аб II Рэспубліканскім
конкурсе маладых талентаў
"Зорка ўзышла над Беларуссю"

1. II Рэспубліканскі конкурс маладых талентаў "Зорка ўзышла над Беларуссю" (далей – конкурс) праводзіцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, абласнымі і Мінскім гарадскім выканкамамі (арганізатары) сумесна з Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспублікі Беларусь, закрытымі акцыянернымі таварыствамі "Другі нацыянальны тэлеканал" і "Сталічнае тэлебачанне", Цэнтральным камітэтам грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі".

2. Конкурс праводзіцца з мэтай выяўлення і падтрымкі таленавітай моладзі.

3. Задачамі конкурсу з'яўляюцца:

рэалізацыя мастацкага патэнцыялу таленавітай моладзі ў розных відах і жанрах мастацкай творчасці;

далучэнне моладзі да лепшых узораў музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва;

фарміраванне эстэтычнага густу моладзі;

стварэнне спрыяльных умоў для самарэалізацыі асобы;

удасканаленне прафесійнага майстэрства і выканальніцкай культуры ўдзельнікаў конкурсу;

прапаганда беларускай нацыянальнай культуры;

стварэнне нацыянальнага кадравага рэзерву з лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі для работы ў сферы культуры.

4. Тэрміны правядзення конкурсу: лістапад 2013 года – красавік 2014 года.

5. У конкурсе могуць удзельнічаць навучэнцы, студэнты і педагагічныя работнікі ўстаноў адукацыі (акрамя студэнтаў і навучэнцаў устаноў адукацыі ў сферы культуры), іншыя прадстаўнікі таленавітай моладзі краіны (далей, калі не вызначана іншае – канкурсанты) ва ўзросце ад 16 да 31 года.

Узрост канкурсантаў вызначаецца па стану на 1 лістапада 2013 г.

Студэнты і навучэнцы ўстаноў адукацыі ў сферы культуры могуць прымаць удзел у мерапрыемствах конкурса з пазаконкурснымі выступленнямі.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

“Эстрадныя спевы”;

”Народныя спевы”;

“Аўтарская песня”;

“Размоўны жанр”;

“Сучасны танец”;

“Харэограф-пастаноўшчык па сучасных напрамках харэаграфіі”;

“Жывапіс і графіка”;

“Скульптура”;

“Дызайн”;

“Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”;

“Фатаграфія”;

“Сацыяльная рэклама”;

“Рэжысура масавых свят, тэатралізаваных прадстаўленняў і шоў-праграм”.

7. У конкурсе прымаюць удзел асобныя канкурсанты і калектывы канкурсантаў (дуэт, трыо, квартэт і г.д.).

8. Конкурс праводзіцца ў тры этапы, з якіх першы і другі з’яўляюцца адборачнымі, трэці – заключным.

9. Першы этап праводзіцца ў лістападзе-снежні 2013 года аддзеламі ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённых і гарадскіх выканкамаў.

Для правядзення першага адборачнага этапа рашэннямі аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённых і гарадскіх выканкамаў ствараюцца арганізацыйныя камітэты, вызначаюцца канкрэтныя тэрміны правядзення першага адборачнага этапа, падачы заявак, фарміруюцца адпаведныя адборачныя камісіі, у склад якіх уключаюцца дзеячы культуры і мастацтва рэгіёна, кіраўнікі і спецыялісты ў сферы культуры.

Па выніках правядзення першага адборачнага этапа адборачная камісія ў кожнай намінацыі вызначае трох лепшых канкурсантаў (калектываў канкурсантаў).

10. Другі адборачны этап конкурсу праводзіцца ў студзені-лютым 2014 года галоўнымі ўпраўленнямі (упраўленнямі) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў.

У другім адборачным этапе прымаюць удзел пераможцы першага этапа конкурсу, а таксама прадстаўнікі творчай моладзі, якія пражываюць і (або) працуюць у абласных цэнтрах і г.Мінску, у тым ліку

навучэнцы, студэнты, педагагічныя работнікі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі.

Для правядзення другога адборачнага этапа загадамі галоўных ўпраўленняў (упраўленняў) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў ствараюцца арганізацыйныя камітэты, вызначаюцца канкрэтныя тэрміны правядзення дадзенага этапа, падачы заявак канкурсантамі, калектывамі канкурсантаў ці кіраўнікамі ўстаноў адукацыі, аддзеламі ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённых і гарадскіх выканкамаў.

Па выніках правядзення другога адборачнага этапа ў кожнай намінацыі вызначаюцца пераможцы – па пяць лепшых канкурсантаў (калектываў канкурсантаў) ад кожнай вобласці і ад г.Мінска.

11. У трэцім заключным этапе конкурсу прымаюць удзел пераможцы другога этапа.

12. Заключны этап конкурсу праводзіцца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй Рэспублікі Беларусь, Цэнтральным камітэтам грамадскага аб'яднання ”Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі“, закрытымі акцыянернымі таварыствамі “Другі нацыянальны тэлеканал” і “Сталічнае тэлебачанне” у красавіку 2014 года.

13. Склад арганізацыйнага камітэта заключнага этапа конкурсу (далей – аргкамітэт) зацвярджаецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь на падставе прапаноў абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага камітэта грамадскага аб'яднання ”Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі“, Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, закрытых акцыянерных таварыстваў “Другі нацыянальны тэлеканал” і “Сталічнае тэлебачанне”.

14. Аргкамітэт:

ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем конкурсу;

распрацоўвае і зацвярджае праграмныя патрабаванні конкурсу;

прымае заяўкі на ўдзел у конкурсе;

прымае рашэнне аб допуску да ўдзелу ў конкурсе;

накіроўвае афіцыйныя запрашэнні асобам, дапушчаным да ўдзелу ў конкурсе;

пры наяўнасці пазабюджэтных сродкаў на правядзенне конкурсу усталёўвае спецыяльныя прэміі і іх памер;

зацвярджае склады журы заключнага этапа конкурсу, якія адначасова з'яўляюцца адборачнамі камісіямі другога адборачнага этапа;

зацвярджае графік работы журы, конкурсныя праграмы (патрабаванні) па кожнай намінацыі на ўсіх этапах конкурсу, вызначае тэрміны і месцы правядзення заключнага этапа конкурсных выступленняў па намінацыях;

аказвае садзейнічанне ў бранiраванні месцаў у гасцініцы для канкурсантаў і суправаджаючых асоб па папярэднім узгадненні;

разглядае звароты, звязаныя з парадкам арганізацыі і правядзенні конкурсу;

забяспечвае асвятленне ходу падрыхтоўкі, правядзення і вынікаў конкурсу ў сродках масавай інфармацыі;

вырашае іншыя пытанні падрыхтоўкі і правядзення конкурсу.

15. Для ўдзелу ў заключным этапе конкурсу да 1 красавіка 2014 г. галоўнымі ўпраўленнямі (упраўленнямі) ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі абласных і Мінскага гарадскога выканкамаў, накіроўваюцца заяўкі па форме згодна з дадаткамі 1 і 2 да дадзенага Палажэння. Дата паступлення заяўкі фіксуецца па паштоваму штэмпелю.

Да заяўкі дадаюцца: копія дакумента, які можа засведчыць асобу, выпіска з пратакола пасяджэння журы аб допуску да ўдзелу ў заключным этапе конкурсу, праграма выступлення ці спіс работ, назва праекта (на кожнага канкурсанта (калектыва) у 5 экзэмплярах і два каляровых фотаздымка канкурсанта (калектыва) памерам 9х13 см на глянцаванай паперы.

Канкурсанты намінацыі “Рэжысура масавых свят, тэатралізаваных прадстаўленняў і шоу-праграм” да заяўкі дадаюць творчую работу (разгорнуты сцэнарны план масавага свята, ці тэатралізаванага прадстаўлення, ці шоу-праграмы).

16. Заяўка з дакументамі, якія прыкладаюцца, накіроўваецца ў аргкамітэт па адрасу: 220086 г. Мінск, вул. Каліноўскага, 12, Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Інстытут культуры Беларусі”.

17. Пры паступленні няпоўнага пакета дакументаў, а таксама паступленні іх пасля вышэйназванага тэрміна заяўкі не разглядаюцца.

18. Канкурсантам (калектывам канкурсантаў) паведамляецца аб допуску да конкурсных выступленняў заключнага этапа не пазней, чым за 10 дзён да пачатку конкурсу.

У выпадку адмовы канкурсанта (калектыва канкурсантаў) ад удзелу ў конкурсе дакументы не вяртаюцца.

19. Конкурсныя выступленні па намінацыях “Эстрадныя спевы” і “Народныя спевы” праводзяцца ў два туры, астатніх – у адзін тур.

Рашэннем журы на другі тур дапускаецца не болей 50 % удзельнікаў першага тура.

20. Парадак выступлення канкурсантаў устанаўліваецца жараб'ёўкай і захоўваецца да канца заключнага этапа.

Конкурсныя выступленні і прагляды праводзяцца публічна.

21. Змены ў праграмах, замены работ, праектаў не дапускаюцца.

Усе творы (музычнага, размоўнага жанру) павінны выконвацца напамяць. Кожны твор (работа) можа быць выканана (прадстаўлена) толькі адзін раз.

22. Канкурсанты прыбываюць на конкурс са сваімі канцэртмайстрамі.

23. Канкурсанты заключнага этапа конкурсу намінацый "Жывапіс і графіка", "Скульптура", "Дызайн", "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва" для выканання графічных, жывапісных, скульптурных работ павінны мець свае неабходныя інструменты і матэрыялы (акрамя мальбертаў, станкоў і планшэтаў).

24. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляе журы па кожнаму канкурсанту (калектыву канкурсантаў).

У намінацыях "Эстрадныя спевы", "Народныя спевы" вынікі вызначаюцца з улікам выступлення канкурсанта на першым і другім турах.

25. Журы:

ацэньвае выкананне канкурсантамі (калектывамі канкурсантаў) твораў;

афармляе пратаколы вынікаў выступленняў канкурсантаў (калектыва канкурсантаў);

вызначае пераможцаў і дыпламантаў, уладальнікаў спецыяльных прэмій, грамат конкурсу ў кожнай намінацыі і прадстаўляе іх спіс у аргкамітэт для ўзнагароджання;

інфармуе канкурсантаў (калектывы канкурсантаў) аб выніках іх удзелу ў конкурсе;

фарміруе праграму выступленняў пераможцаў конкурсу ў апошні дзень яго правядзення, вызначае склад канкурсантаў (калектываў канкурсантаў);

разглядае падчас правядзення конкурсу звароты канкурсантаў (калектываў канкурсантаў) па выніках і адзнаках выступленняў.

Журы конкурсу мае права прымаць рашэнне аб скарачэнні праграмы ці спыненні выканання.

26. Падвядзенне вынікаў конкурсу ажыццяўляецца журы адкрытым галасаваннем персанальна па кожным канкурсанце (калектыве канкурсантаў) з улікам вынікаў усіх этапаў конкурсу.

Член журы, які мае дачыненне да канкурсанта (роднасныя сувязі, вучоба, праца і іншае), не прымае ўдзел у галасаванні ў дачыненні дадзенага канкурсанта.

27. Рашэнні журы прымаюцца на пасяджэннях і афармляюцца пратаколамі. Журы правамоцна прымаць рашэнне, калі на пасяджэнні прысутнічае не меней двух трэціх зацверджанага складу журы. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала больш паловы прысутных на пасяджэнні членаў журы. У выпадку роўнасці галасоў меркаванне старшыні журы з'яўляецца вызначальным.

Рашэнні журы з'яўляюцца канчатковымі і перагляду не падлягаюць.

Аб'ява вынікаў конкурсу ажыццяўляецца ў апошні дзень правядзення конкурсу.

28. Пераможцы конкурсу вызначаюцца ў кожнай намінацыі і ўзнагароджваюцца дыпломамі І, ІІ, ІІІ ступеней з прысваеннем звання лаўрэата і ўручэннем грашовых прэмій.

Пераможца-калектыў канкурсантаў узнагароджваецца агульным дыпломам з указаннем ступені (І, ІІ, ІІІ) і прысваеннем звання лаўрэата, уручэннем грашовай прэміі.

Пераможцам конкурсу ўсталёўваюцца грашовыя прэміі ў памеры:

лаўрэату і ўладальніку дыплома І ступені - 3 мільёна беларускіх рублёў;

лаўрэату і ўладальніку дыплома ІІ ступені - 2 мільёна беларускіх рублёў;

лаўрэату і ўладальніку дыплома ІІІ ступені - 1 мільён беларускіх рублёў.

29. Журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы і прэміі конкурсу, прысудзіць у адной намінацыі некалькі дыпломаў ІІ і ІІІ ступеней і прэмій, змяняць па ўзгадненні з аргкамітэтам памер прэмій у рамках агульнага прызавога фонду конкурсу ў залежнасці ад колькасці пераможцаў.

30. Два канкурсанта (калектыва канкурсантаў) фінальнага тура конкурсу ў кожнай намінацыі, не атрымаўшыя дыпломаў І, ІІ і ІІІ ступені і звання лаўрэата конкурсу, могуць узнагароджвацца дыпломамі з прысваеннем звання дыпламанта конкурсу і ўручэннем заахвочвальнай прэміі ў памеры 500 тысяч беларускіх рублёў.

31. Канкурсанты (калектывы канкурсантаў), якія не сталі пераможцамі конкурсу, могуць адзначацца ганаровымі граматамі.

32. Журы можа адзначыць дыпломамі (граматамі) педагагічных работнікаў (кіраўнікоў), канкурсантаў (калектывы канкурсантаў), якія дасягнулі на конкурсе значных творчых вынікаў, а таксама лепшых канцэртмайстраў.

33. Узнагароджанне пераможцаў і іншых канкурсантаў (калектываў канкурсантаў), ажыццяўляецца ва ўрачыстых абставінах, пасля чаго праводзіцца выступленне ўсіх пераможцаў конкурсу ў

заключным гала-канцэрце. Пераможцы конкурсу прымаюць удзел у мастацкай выставе.

34. Дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі ў мэтах заахвочвання ўдзельнікаў конкурсу, педагагічных работнікаў і канцэртмайстраў па ўзгадненню з аргкамітэтам могуць устанаўліваць грашовыя прэміі і іншыя віды заахвочвання.

35. Прапаганду і асвятленне, у тым ліку і ў друкаваных сродках масавай інфармацыі, усіх этапаў конкурсу забяспечваюць Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь, закрытыя акцыянерныя таварыствы “Другі нацыянальны тэлеканал” і “Сталічнае тэлебачанне”.

36. За атрыманне канкурсантамі і канцэртмайстрамі ў час правядзення рэпетыцый і конкурсных выступленняў траўм, страту і пашкоджанне іх маёмасці арганизатары адказнасці не нясуць.

37. Выдаткі па праездзе, пражыванню і харчаванню канкурсантаў, накіраваных для ўдзелу ў конкурсе, могуць ажыццяўляцца ўстановамі адукацыі рэспубліканскай формы ўласнасці за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і (ці) іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, установамі адукацыі камунальнай формы ўласнасці - за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў і (ці) іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Аплата работы членаў журы заключнага этапа і адборачнай камісіі другога адборачнага этапа ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія вылучаюцца Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў.

38. Фінансаванне адборачных этапаў конкурсу ажыццяўляецца са сродкаў мясцовых бюджэтаў, акрамя выдаткаў, названых у часцы другой пункта 37.

Фінансаванне правядзення заключнага этапа конкурсу ажыццяўляюцца са сродкаў рэспубліканскага бюджэту, якія вылучаюцца Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў.

У адпаведнасці з рашэннем савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі для заахвочвання пераможцаў конкурсу могуць выкарыстоўвацца фінансавыя сродкі гэтага фонду.

39. Для фінансавання мерапрыемстваў конкурсу на ўсіх этапах конкурсу могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, якія не забаронены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да Палажэння аб
II Рэспубліканскім конкурсе
маладых талентаў
“Зорка ўзышла над Беларуссю”

Заяўка
канкурсанта II Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў
“Зорка ўзышла над Беларуссю”

1. Прозвішча ____________________

2. Уласнае імя ____________________

3. Імя па бацьку (калі такое маецца)____________________

4. Дата нараджэння ____________________

5. Намінацыя ____________________

6. Назва і адрас установы адукацыі, курс, клас ____________________

____________________

7. Месца працы, пасада____________________

8. Хатні адрас канкурсанта ____________________

____________________

9.Тэлефон, факс ____________________

10. Прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое маецца) педагагічнага работніка (без скарачэнняў)____________________

____________________

____________________

11. Неабходная колькасць месцаў для браніравання ў гасцініцы, інтэрнаце (жаночых, мужчынскіх) ____________________

12. Творчыя дасягненні ____________________

____________________

____________________

Кіраўнік установы
(канкурсант)

(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

Дадатак 2
да Палажэння аб
II Рэспубліканскім конкурсе
маладых талентаў
"Зорка ўзышла над Беларуссю"

Заяўка
калектыва канкурсантаў II Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў
"Зорка ўзышла над Беларуссю"

1. Найменне калектыву канкурсантаў ______________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

2. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), год нараджэння ўдзельнікаў калектыву канкурсантаў

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

3. Намінацыя ______________________________________________

4. Назва і адрас установы, тэлефон, факс ___________________________

______________________________________________________________

______________________________________________________________

5. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) кіраўніка калектыву канкурсантаў (без скарачэнняў) _______________________

______________________________________________________________

6. Неабходная колькасць месцаў для браніравання ў гасцініцы, інтэрнаце (жаночых, мужчынскіх) ___________________________________

______________________________________________________________

7. Творчыя дасягненні калектыву канкурсантаў______________________

______________________________________________________________

Кіраўнік установы
(кіраўнік калектыву канкурсантаў)

______________ ____________________

(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

ДАДАТАК
да загада
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
29.10.2013 № 170

СКЛАД
арганізацыйнага камітэта заключнага этапа
II Рэспубліканскага конкурсу маладых
талентаў ”Зорка ўзышла над Беларуссю“

| | | |
|---|---|---|
| Чэрнік<br>Васілій Мечаслававіч | - | намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь (старшыня) |
| Аленская<br>Ларыса Канстацінаўна | - | намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама |
| Баразна<br>Міхаіл Рыгоравіч | - | рэктар установы адукацыі ”Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў“ |
| Бондар<br>Юрый Паўлавіч | - | рэктар установы адукацыі ”Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў“ |
| Варанюк<br>Дзмітрый Сяргеевіч | - | сакратар Цэнтральнага камітэта грамадскага аб’яднання ”Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі“ |
| Даўгала<br>Ірына Віктараўна | - | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама |
| Дулава<br>Кацярына Мікалаеўна | - | рэктар установы адукацыі ”Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі“ |
| Карпенка<br>Ігар Васільевіч | - | намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама |
| Каранеўскі<br>Павел Сямёнавіч | - | намеснік генеральнага дырэктара закрытага акцыянернага таварыства ”Сталічнае тэлебачанне“ |
| Мікульская<br>Анжэліна<br>Уладзіміраўна | - | дырэктар дырэкцыі спецыяльных праектаў закрытага акцыянернага таварыства ”Другі нацыянальны тэлеканал“ |

| | | |
|---|---|---|
| Сінкавец<br>Анатолій Анатольевіч | - | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама |
| Скрабко<br>Павел Канстанцінавіч | - | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама |
| Трухан<br>Руслан Іванавіч | - | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама |
| Ціткоў<br>Алег Уладзіміравіч | - | дырэктар дырэкцыі спецыяльных праектаў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь |
| Цырэльчук<br>Аляксандр<br>Аляксандравіч | - | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама |
| Шэдко<br>Дзмітрый Генадзьевіч | - | намеснік Міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь |
| Якжык<br>Віктар Віктаравіч | - | намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь |